***Новак В.С.***

# ТРАЕЦКАЯ АБРАДНАСЦЬ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ: БАГАЦЦЕ МЯСЦОВАЙ СПЕЦЫФІКІ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю )*

Траецкая абраднасць беларусаў, як і іншыя віды веснавых каляндарных абрадаў, захоўваюць агульнаэтнічную аснову і вылучаюцца рэгіянальна-лакальнымі асаблівасцямі, якія выяўляюцца на ўзроўні розных элементаў, звязаных з дзеяннямі, прадметнай атрыбутыкай, прыкметамі і павер'ямі, песенным суправаджэннем. Адзначым, што асаблівай развітасцю традыцыя святкавання Тройцы ў беларусаў не вылучаецца. Даследчыца В.К. Сакалова падкрэсліла, што "цэласны траецкі абрадавы комплекс склаўся ў рускіх: 1. Упрыгожванне дамоў, двароў, цэркваў і вуліц зелянінаю, бярозамі. 2. Завіванне бярозак і вянкоў. 3. Кумленне пад бярозамі. 4. Упрыгожванне бярозкі, шэсці з ёй і патапленне. 5 Кіданне вянкоў у ваду. 6. Агульнае абрадавае частаванне дзяўчат" [1, с. 206]. З названых структурных кампанентаў у найлепшай ступені прадстаўлены на тэрыторыі Гомельшчыны звычаі ўпрыгожвання хаты і падвор'яў зелянінай, а таксама ў памяці інфарматараў захаваліся сціплыя звесткі пра абрады завівання і развівання бярозкі, кумленне і інш. Звернемся непасрэдна да экспедыцыйных матэрыялаў, зафіксаваных у розных раёнах Гомельскай вобласці, каб засведчыць ступень захавання на сённяшні дзень тых ці іншых траецка-сёмушных абрадаў і звычаяў. Напрыклад, адносна мясцовых асаблівасцей траецкай абраднасці на тэрыторыі Добрушчыны адзначым, што ў розных вёсках можна заўважыць лакальныя адметнасці асобных рытуалаў і абрадавых дзеянняў. Заўважым, што палявыя экспедыцыйныя матэрыялы дазваляюць ўмоўна рэканструяваць траецкі абрадавы комплекс Добрушчыны, які, можна меркаваць, меў у мінулым цэласны характар.

Пра абрад кумлення прыгадалі звесткі жыхары вёсак Баршчоўка, Агародня, Ларышчава, Івакі, Карма, Кругавец, Крупец, Цerахоўка, Жгунь і

г. Добруш. У асноўным змест мясцовых абрадавых дзеянняў, аб'яднаных назвай "кумленне", у в. Ларышчава вылучаўся адметнай семантыкай і быў звязаны з агульным частаваннем, калі "маладыя выносілі стол, елі, выпівалі – кумiлiся" (запісана ад Пракапцовай Лідзіі Пятроўны, 1933 г.н.).

У в. Усохі, сэнс абраду кумлення, які адбываўся на другі дзень Тройцы, знайшоў адлюстраванне ў звычаі "гасцяваць": "Хадзілі ў госці адзін да аднаго, збіраліся кумаўё і куміліся" (запісана ад Прэндзіч Праскоўі Іосіфаўны, 1910 г.н.). У в. Церахоўка гэты абрад ўзнаўляў агульнабеларускую традыцыю кумлення і адбываўся на беразе рэчкі, дзе на другі дзень пасля Тройцы "збіраліся дзяўчаты, спявалі песні, цалаваліся і станавіліся сяброўкамі" (запісана ад Цяньковай Таццяны Сідараўны, 1924 г.н.). Паводле ўспамінаў Евы Піліпаўны Сердзюковай, 1930 г.н., "у нядзелю ўжэ былі толькі дзеўкі. Дзеўкі ўжо ішлі на рэчку, там пелі песні, плялі вянкі, цалаваліся. І тады ўжо шчыталася, што яны падругі, і ўвесь год да Тройцы ня будуць ругацца, будуць дружыць" (запісана ў г.п. Церахоўка).

Абрад кумлення ў в. Агародня адрозніваўся багатай мясцовай спецыфікай: удзельнічалі ў выкананні абрадавых дзеянняў прадстаўнікі трох груп: дзеці, сямейныя пары, сталыя людзі. Кумленне дзяцей нагадвала тэатралізаванае шэсце па вуліцы пераапранутых у "бабу", "барыню": "На першы дзень Тройцы куміліся дзеці. Збіраліся ў хаце, ім рабілі квас з хлеба, жарылі блінцоў, пяклі пампушак. Дзеці паядуць і ідуць па вуліцы. Здзелаюць бабу і барыню надзенуцца ў што зра. Ідуць па вуліцы і забаўляюць людзей, танцуюць і спяваюць:

Барыня, барыня,
Барыня-сударыня,
Патанцуй нам, барыня,
Патанцуй, сударыня" (запісана ад Хадзьковай Вольгі Васільеўны, 1938 г.н.).

Калі куміліся на другі дзень дарослыя людзі, то абавязковым быў абход імі двароў аднавяскоўцаў: "Выносілі стол на вуліцу. Кожны нясе, што ў каго

дома ёсць, каб накрыць стол: яйцы, пірагі, кашу” (запісана ў в. Агародня ад Хадзьковай Вольгі Васільеўны, 1938 г.н.). Паводле ўспамінаў Сямёна Рыгоравіча Руднікава, 1941 г.н., на другі дзень Тройцы кумяцца сямейныя пары: “Кумленне праходзіць дужа эмацыянальна, з бальшой выдумкай і пераадзяваннем (жанчыны – у мужчынскае, мужыкі – у жаночыя плацці, платкі…)” (запісана ў в. Агародня). На трэці дзень куміліся старыя людзі: “Сабіраюцца ў хаце, пасядзяць, пагавораць, патанцуюць і ідуць дадому” (запісана ў в. Агародня).

Важны элемент траецкай абраднасці – упрыгожванне зелянінай падвор’яў. З гэтай мэтай вяскоўцы выкарыстоўвалі галінкі ліпы, клёну, бярозы, лугавыя травы, мяту. Адзначым, што папярэдне зеляніну асвячалі ў царкве, а потым развешвалі ўсюды і верылі ў яе магічную сілу “адганяць ад двара ўсё кепскае” (запісана ў в. Карма ад Парукавай Еўдакіі Лявонаўны, 1927 г.н.). З хуткасцю высыхання зеляніны, якой былі прыбраны падвор’і і хаты вяскоўцаў, звязвалі хуткасць высыхання сена (прынцып семільнай магіі): “Як у хату прынясуць голькі і пасохнуць яны быстра, то сена будзе добра сохнуць” (запісана ў в. Кругавец ад Кабанчук Святланы Мікалаеўны, 1938 г.н. (перасяленка з в. Астрагляды Брагінскага раёна)).

Жыхары в. Кругавец траецкую зеляніну, як і ў іншых мясцовасцях Гомельшчыны, называлі “маем”, захоўвалі яе да Вялікадня і потым ёю “выганялі з хаты ўсю нечысць”, прыгаворваючы: “Май, май, усю нечысць з хаты выганяй” (запісана ад Філімонцавай Ніны Платонаўны, 1937 г.н.). У гэтай вёсцы “май” клалі “ў падвалах, штоб мышэй не было і гаварылі так: “Май, мышэй ганяй” (запісана ў в. Кругавец ад Красноўскай Наталлі Васільеўны, 1937 г.н.). Рабілі яшчэ так, бо былі перакананы, што “май” такую сілу мая, якая ад плахога ахраняе і чалавека, і хату” (запісана ў в. Кругавец ад Красноўскай Наталлі Васільеўны, 1937 г.н.). Аналагічныя дзеянні выконвалі ў іншых вёсках Добрушчыны. “Як атыйдзе Тройца, як нядзелю павісіць зелень, яе знімалі і клён няслі ў падвал, там стыркалі, каб не было мышэй” (запісана ў в. Агародня ад Хадзьковай Вольгі Васільеўны, 1938 г.н.). У

в. Усохі верылі, што “май” засцерагае “хату ад пажару, а хлеў, дзе скаціна стаяла, – ад ведзьмаў” (запісана ад Прэндзіч Праскоўі Іосіфаўны, 1910 г.н.).

Рытуал аблівання вадой з’яўляўся адметным элементам у мясцовай традыцыі святкавання Тройцы ў в. Баршчоўка: “У сухі траецкі чацвер abліваліся вадой усе: і дарослыя, і дзеці” (запісана ад Машуковай Пелагеі Лукінічны, 1921 г.н.). Можна меркаваць, што ў прыведзеным кантэксце вада – зацерагальны і ачышчальны магічны сродак, а таксама выкананне названых дзеянняў з вадой магло забяспечыць выкліканне дажджу. Невыпадкова, калі “да Троіцы не было дажджу, то на другі дзень збіралі ўдоў, запрагалі і пераворвалі ўпоперак вуліцу, і пелі песні, клікалі дождж” (запісана ў в. Кругавец ад Філімонцавай Ніны Платонаўны, 1937 г.н.). У гэтай жа вёсцы на Тройцу было прынята кідаць у ваду з маста свежую траву і лугавыя кветкі. З выкананнем гэтых дзеянняў былі звязаны надзеі вяскоўцаў на атрыманне багатага ўраджаю: “Калі кінеш траву ці цвяты, то год будзе багаты, усё ўродзіць, а калі не, то галодны год будзе, ці засуха будзе, ці жыта не ўродзя” (запісана ад Красноўскай Наталлі Васільеўны, 1937 г.н.).

Гушканне на арэлях і пераапрананне ў жаніха і нявесту , а таксама выкананне вясельных песень – важныя моманты ў святкаванні Тройцы ў в. Церахоўка: “У першы дзень свята збіралася моладзь, падлеткі. Гулялі, спявалі, каталіся на качэлях, пераадзяваліся ў жаніха і нявесту. Спявалі вясельныя песні” (запісана ад Сердзюковай Евы Піліпаўны. 1930 г.н.).

На чацвёрты дзень пасля святкавання Тройцы ў в. Баршчоўка, які меў назву “Аброчнае”, імкнуліся нічога не рабіць, бо на працягу трох гадоў у вёсцы здараліся няшчасці: то саранча знішчыць пасевы, то град паб’е жыта, то здарыцца пажар і згараць усе пабудовы: “От тагда ўжэ людзі абракліся. Сказалі, шчо ў эту срэду дзелаць нічога не будзем, шчоб Бог не наказуваў нас так жыстока. Вот паслі трох такіх случаяў і абраклісь” (запісана ад Грудавенка Валянціны Гаўрылаўны, 1930 г.н.).

Як і ў вёсках Добрушскага раёна, жыхары Буда-Кашалёўшчыны таксама здаўна прытрымліваюцца традыцыйных народных прадпісанняў,

звязаных са святкаваннем Тройцы, якую называлі Пяцідзесятніцай, бо “явленіе Святога Духа на апосталаў было ў пяцідзесяты дзень па Вялікадню. Гэта трайная радасць. Гэта Бог Ацец, Бог Сын, Бог Святы Дух. Тры дні святкавалі гэта свята” [2, с. 147]. У стуктуры мясцовага траецкага абрадавага комплексу можна вылучыць, зыходзячы з палявых запісаў, такія кампаненты, як гушканне на арэлях, упрыгожванне хаты і падвор’я зелянінай, абрады завівання і развівання вянкоў, кумленне (“Даўней у нашай вёсцы на Тройцу куміліся – гатавалі настойку з парэчак, хадзілі ў госці, частавалі ёю суседзей”– в. Глазаўка) [2, с. 145], выкананне траецкіх песень. Як адзначылі жыхары п. Чарняціна, абрад развівання вянкоў выконвалі абавязкова, бо “бярозы маглі праклясці дзеўку, якая яго завівала, і яна магла памерці” [2, с. 147]. Акрамя адзначаных абрадавых момантаў, у асобных вёсках менавіта на Тройцу мелі месца абрад пераносу свечкі (у в. Буда-Люшаўская “на Тройцу свячу пераношвалі” [2, с. 145], а таксама абрад ваджэння куста:“У гэты дзень прыбіралі ў кляновае адзенне і дзелалі такі ж вянок самай прыгожай дзеўкі. Яе называлі “куст” і вадзілі вакруг яе харавод, пелі песні. Удзельнічалі адны незамужнія дзеўкі” [2, с. 147].

Магічнае значэнне траецкай зяляніны (галінак ліпы) пацвердзілі жыхары в. Бацунь Буда-Кашалёўскага раёна: “А потым зелень ету сабіралі і выносілі ў сарай, клалі, дзе куры нясуцца, абкладалі там, дзе бульбу закапваюць, штоб мышы не рыліся. Май жа ўсё плахое выганяў” [2, с. 145]. Засушаныя галінкі ліпы і клёну выкарыстоўвалі ў абрадзе выклікання дажджу: “Еслі нет даждзя, іх брасают в речку” [2, с. 145].

У комплексе траецкай абраднасці Мазырскага раёна вылучаюцца такія элементы, як упрыгожванне хаты і падвор’я зелянінай, ваджэнне карагодаў, падрыхтоўка святочных страў (“булкі гатовілі, халадзец варылі”), шлюбная варажба на вянках. Амаль усе інфарматары пацвердзілі, што “гулялі” на Тройцу тры дні. Верылі ў магічную сілу зяляніны, якой упрыгожвалі хату і двор, высахшыя галінкі выкарыстоўвалі ад мышэй (запісана ў г. Мазыр ад Громік Кацярыны Фёдараўны, 1943 г.н.), “клён павісіць і нясуць яго на

чэрдак, штоб мышэй не было” (запісана ў г. Мазыр ад Целяпун Таццяны Аляксандраўны, 1916 г.н.). Некаторыя жыхары звязвалі з траецкай зелянінай надзеі на дабрабыт: “Нада було, штоб зелень у хаце була, штоб усё добра ў хаце было” (запісана ў г. Мазыр ад Маслоўскай Ефрасінні Дзмітрыеўны, 1922 г.н.). Паводле ўяўленняў мазыран пры дапамозе пасвечаных у царкве ліпавых і кляновых галінак можна было засцерагчыся ад ведзьмаў (запісана ў г. Мазыр ад Барысенкі Фёдара Іванавіча, 1927 г.н.), а таксама траецкая зелянiна, якая захоўвалася ў хаце на працягу года, з’яўлялася выдатным сродкам засцярогі ад навальніцы (запісана ў г. Мазыр ад Кашкаровай Марыі Фёдараўны, 1921 г.н.).

Абрады завівання вянкоў і кумлення – цэнтральныя элементы траецкай абраднасці ў вёсках Гомельскага раёна:“Куміліся, завівалі вяночкі з галінак бярозы, вадзілі карагоды, спявалі песні” (запісана ў в. Церуха ад Казіміравай Кацярыны Ксенафонтаўны, 1918 г.н.). “Тое, што на Беларусі абрад завівання і развівання бярозкі лакальна абмежаваны, сустракаецца не ўсюды, а толькі ва ўсходніх, часткова цэнтральных раёнах і наогул не прадстаўлены поўны комплекс элементаў абраду з бярозкай (адсутнасць на заключным этапе абходаў з бярозкай дамоў, патаплення бярозкі і г.д.), дазваляе, як адзначае В.К.Сакалова, прыйсці да высновы, што распаўсюджванне абраду завівання і развівання бярозкі на Беларусі звязана з рускім культурным уплывам” [3, с. 80]. Паводле ўспамінаў жыхароў в. Брылёва, у іх мясцовасці быў вядомы абрад кумлення, калі дзяўчаты хадзілі ў лес і завязвалі галіны дзвюх бяроз, праходзячы праз утвораную “бярозавую арку”, куміліся, цалаваліся, нібы прысягаючы, дзякуючы такім дзеяннем, на вернасць у сяброўстве. У в. Зябраўка ў абрадзе кумлення “прымалі ўдзел дзеці на першы дзень Тройцы, а на другі дзень – старэйшыя. Спачатку ідуць па вуліцы вёскі, адзенуцца ў работнікаў, касароў, цыганоў, калі хто хоча удзельнічаць у гэтым, то даюць сала, яйкі, а потым збіраюцца ў хату і кумяцца, і спяваюць песні”.

З абрадам завівання вянкоў у в. Прыбыткі былі звязаны прадказанне лёсу, шлюбная варажба: “Пры завіванні загадвалі пажаданні (ці буду я жыва, ці выйду замуж). Калі галінкі заставаліся свежыя, то дзяўчына выйдзе замуж, а калі завядшыя – то не.” (запісана ад Янчанка Г.А., 1931 г.н.). Па стану зеляніны, якой упрыгожвалі вокны  і ўсцілалі падлогу ў в. Міхалькі, варажылі аб тым, якім будзе надвор’е: “Калі за тры дні лісце на ветках засохне, то счыталі, што лета будзе жаркае і сухое, а калі не, то будуць летам ісці дажджы” (запісана ад Кавалёвай Еўдакіі Фадзееўны, 1927 г.н.). У адрозненне ад іншых мясцовасцей Гомельшчыны, у якасці зеляніны, як адзначылі інфарматары з некаторых вёсак Гомельскага раёна, выкарыстоўвалі для ўпрыгожвання хаты галінкі каліны і нават асіны, нягледзячы на тое, што апошняе дрэва ў народных вераваннях асэнсоўвалася як “нехарошае дзерава” (в. Зялёны Гай): “Раней прыбіралі хату зелянінай, да і зараз ставяць на вокны, вешаюць на дзверы і каліну, і асіну. А раней усё гэта клалі на поле і нядзелю не ўбіралі. Потым гэтую зеляніну запарвалі і мылі галаву” (запісана ў в. Галавінцы ад Рудзянковай Марыі Мікітаўны, 1927 г.н.); “Прыходзе Тройца, і на Тройцу мы вешалі над дзвярамі ў сараі о такія о асінкі, ветачкі. І тыя веткі можаш патом у хаце вешаць, каб зашчыта ад гразы была, ад молніі, штоб не папала молнія у сарай ці куда-небудзь” (запісана ў в. Клімаўка ад Кукалевай Марыі Данілаўны, 1935 г.н.). Дзейснасць зеляніны, паводле народных уяўленняў, узмацнялася пасля рытуалу яе асвячэння ў царкве, і выкарыстоўвалі яе з мэтай паляпшэння ўраджайнасці капусты (“Пасвячоную бярозу клалі на капусту, каб урадзіла – запісана ў в. Пакалюбічы ад Рабцавай Валянціны Фёдараўны, 1952 г.н.), каб пазбавіцца ад захворванняў скуры (“На Тройцу вешалі клён на  і на дзверы, і на вокны, і ў хату прыносілі. А тады той клён астаўлялі, і калі нарыў які на руцэ ці на назе, так у цёпленьку воду возьмуць, размочваюць, прыкладваюць, і выцягвае тую жыдкасць – запісана ў в. Пясочная Буда ад Гашко Евы Пятроўны, 1934 г.н.), каб валасы добра раслі (“Потым гэтую зеляніну запарвалі і мылі галаву” – запісана ў в. Галавінцы ад Рудзянковай Марыі Мікітаўны, 1927 г.н.).

Адзначалі Тройцу і на тэрыторыі Лоеўскага раёна. Сярод асноўных кампанентаў траецкай абраднасці вылучаюцца як характэрныя для іншых раёнаў Гомельшчыны, так і па-мясцоваму адметныя: упрыгожванне зелянінай хаты і падвор’я, асвячэнне зеляніны ў царкве, наладжванне застолля, фарбаванне яек у зялёны колер і памінанне памерлых, варажба на вяночках з галінак бярозы, кумленне (“наведванне адзін аднаго”), ваджэнне карагодаў, выкарыстанне пасохлай зеляніны з рознымі мэтамі, выкананне траецкіх песень. Звычайна для ўпрыгожвання хаты прыносілі з лесу клён, ліпу і бярозу, бо “гэта бажэственныя дзярэўя. Гэта, кажуць, любімыя дрэвы Ісуса” (запісана ў г.п. Лоеў ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г.н.). Іншы раз выкарыстоўвалі на Тройцу і асіну, як і ў Гомельскім раёне, аднак выключна з прагматычнай мэтай, каб засцерагчы свойскую жывёлу, выратаваць ад хвароб: “Нада, штоб абязацельна была маладая асінка. У сарая тыркалі яе: прадахраняла скаціну” (запісана ў в. Удалёўка ад Малянка Уладзіміра Васільевіча,1929 г.н.); “З асіны закопвалі каля сарая, штоб ніхто нехарошы не хадзіў” (запісана ў в. Ястрабка ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г.н.), “Глядзелі, каб каля хлява карове асіну паставіць, каб кроўю не мачылась. Дак ужо забіваюць кола з асіны” (запісана ў в. Вулкан ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г.н.). Заслугоўваюць увагі і некаторыя іншыя мясцовыя тлумачэнні семантыкі выкарыстання дрэў для ўпрыгожвання: напрыклад, “бярозка – штоб дзеці красівыя былі. Дуб – каб здароўе крэпкае” (запісана ў в. Ястрабка ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г.н.). Як адзначылі лаяўчане, траецкую зеляніну не выкідвалі, напрыклад, тыя галінкі, што ляжалі каля абразоў, там і пакідалі, лічылі: “Яны ад маланкі спасалі, каб тая ў хату не ўляцела.”(запісана ў п. Арол ад Падбярознай Ганны Фёдараўны, 1932 г.н.). У пасёлку Арол, “як астаўся май, то яго на Купалу спальвалі. Бралі засохлыя галінкі з сабой на раку, а там у агне вялікім палілі. Агонь жа той святы” (ад Падбярознай Ганны Фёдараўны, 1932 г.н.). Жыхары в. Гарадок верылі, што забеспячэнню сямейнага дабрабыту таксама будзе спрыяць траецкая зеляніна: “А потым, калі ўсё гэта высахне, звязвалі ў пучкі, вешалі

на чардак для таго, каб усё добра было ў хаце і з жывотным” (запісана ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960” г.н.). У в. Вулкан галінкі зеляніны выкарыстоўвалі “ад плахога чалавека, ад гразы, штоб гад не запаўзаў у двор” (запісана ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г.н.). У п. Пабядзіцель “бярозу вешаюць пад страху ў сараі ці хаце, каб не было пажару” (запісана ад Марозавай Вольгі Пятроўны,1929 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў Лоева, ў іх мясцовасці ўпрыгожвалі хаты зелянінай, каб “адагнаць нячыстую сілу” (запісана ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г.н.).

Прыведзеныя матэрыялы па траецкай абраднасці асобных раёнаў Гомельскай вобласці істотна ўзбагачаюць этнічную траецка-сёмушную традыцыю і з’яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй жыцця нашых продкаў.

Резюме

В статье раскрываются регионально-локальные особенности троицкой обрядности, традиция бытования которой имеет место в разных районах Гомельщины и отличается богатством местной специфики.

Resume

In the article we observe the questions, connected with regional and local ritual peculiarities of Trinity Sunday, it is underlined that this rite is widespread in various regions of Gomel and it differs due to local peculiarities and specific traits.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Соколова, В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов / В.К. Соколова. – М.: Наука, 1979. – 288 с.

2. Жаўруковая песня Радзімы: народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю: манаграфія / ГДУ імя Ф.Скарыны; пад агульнай рэдакцыяй В.С. Новак. – Гомель: Сож, 2008. – 424 с.

3. Шарая, В.М. Завіванне і развіванне бярозкі на Тройцу: абрад і песні / Г.А. Барташэвіч, Т.В. Валодзіна, А.І. Гурскі і інш. // Беларусы. Вусная

паэтычная творчасць / Г.А. Барташэвіч, Т.В. Валодзіна, А.І. Гурскі і інш. – Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В.М. Бялявіна і інш. – Мн.: Бел. навука, 2004. – Т. 7. – 586 с.